Ларыса Геніюш

# Сэрца

Юрка Геніюш

# Да свету

www.kamunikat.org

Бібліятэчка
Беларускага літаратурнага аб'яднання
„Белавежа"
пад рэдакцыяй Яна Чыквіна

Кніжка сёмая

Праект вокладкі Пётр Зарэчны

Publikacja sponsorowana przez Ministerstwo Kultury i Sztuki

Skład komputerowy Jerzy Chmielewski
Druk Spółka Wydawniczo-Poligraficzna ORTHDRUK

Ларыса Геніюш

# СЭРЦА

Беласток 1992

www.kamunikat.org

*ЯНА ЛІЧЫЛА СЯБЕ ЯЦЬВЯЖКАЙ*

*Спадчына Ларысы Геніюш як айсбэрг - толькі частка наверсе. Шмат твораў параскідана сярод сяброў і знаёмых. І сябры параскіданыя па ўсім сьвеце - у Чэха-Славаччыне, дзе Геніюшы жылі да вайны, у вайну і пасьля вайны да 1948 года; нехта паехаў за Акіян, у Амэрыку ды Канаду; некага павязьлі па савецкіх этапах у Сібір.*

*Чым жа дзялілася паэтка са старымі й новымі сябрамі? Душою. Вершамі. Са сталінскіх лягэраў яе вершы ў людзкой памяці раз'ехаліся на Украіну, Беларусь, у Летуву, Польшчу, Чэха-Славаччыну, Расею. Шмат з кім я сустракалася ў яе хаце ў Зэльве, жывуць яе знаёмыя ў Вільні, Львове, Баранавічах, Жлобіне, Менску, Полацку, у малых вёсках і вёсачках.*

*З Ларысай Антонаўнай мы сустракаліся й перапісваліся ад пачатку 60-х гадоў. Таму па яе сьмерці шмат хто перадаў мне яе чарнавікі, машынапісы, нататкі. У мяне ж яе лісты да Міколы Прашковіча - у сярэдзіне 70-х быў такі час, што менчукі баяліся трымаць гэтыя паперы ў сябе; перадавалі іх мне праз Смаргонь, адкуль у Гародню я прывезла іх схаванымі ў багажніку «Волги» сакратара абкаму КПСС. Было і такое.*

*Я дапамагала Ларысе Антонаўне ўкладаць зборнік «На чабары настоена», выйшаў у Менску ў 1982 годзе. Пасьля мяне чытаў яшчэ Максім Танк, прыслаў Ларысе Антонаўне заўвагі - што выкінуць, а што пакінуць... Кнігу «Невадам з Нёмана» 1964 года ўкладаў Уладзімір Караткевіч. Каб перадрукаваць асобныя вершы з праскага зборніка 1942 года «Ад родных ніў», ставіў пад вершамі ня тыя даты. Гэтыя змушаныя праўкі ды перапраўкі зрабілі амаль*

*немагчымай як датоўку вершаў, так і збор усіх магчымых варыянтаў - цяпер пісьменьніцкі ахвіцыёз робіць выгляд, што зьмягчаныя дзеля цэнзуры кніжныя вершы савецкага часу - гэта і ёсьць Ларыса Генюш. Калі ж робяцца «адкрыцьці», то менавіта тымі людзьмі, што мелі й маюць далей доступ да архіваў усяму сьвету вядомай канторы.*

*Разам з крытыкам Тамарай Чабан, - нядаўна памерла, - мы літаральна прасілі выдавецтва, каб пасьмяротную кнігу Ларысы Генюш укладалі мы, хто добра яе ведаў. Натуральна, што нам адмовілі - «такія» кнігі мае права ўкладаць толькі Барыс Сачанка. Празаік і палкоўнік. Той, які трэба.*

*З тэндэнцыйнай і бальшавіцкай прадмовай Сачанкі выйшаў «Белы сон», зь яго ж прадмовай двойчы «Споведзь» - у Менску й Маскве. Напэўна, дзеля таго, каб узнаючы талент Генюш, ня толькі пакаленьне Сачанкі, але й малодшае пакаленьне, а тым самым і тыя, хто толькі ўваходзіць у жыцьцё, ні ў якім разе не падзялялі погляды Ларысы Антонаўны на камунізм і камуністаў. Сачанка піша пра Генюш так, быццам яго любімая савецкая ўлада ўсё жыцьцё апекавалася ёю, на сапраўдны шлях выводзіла, а тая брыкалася... Што зробіш, камуніст - ён і без КПСС камуніст.*

*Між тым «Споведзь» па частках трапляла са мной з Зэльвы ў Гародню, а потым я перадавала рукапіс Васілю Быкаву. Так ён ацалеў.*

*Ад Ларысы Антонаўны рэдакцыі патрабавалі й рэфармаванага савецкага правапісу - бязь мяккіх знакаў і гэтак далей. Так пісаць яна ня ўмела, не хацела й не магла прызвычаіцца. Практычна над тэхнічнай падрыхтоўкай яе кніжак да друку, у тым ліку і двух дзіцячых, мы працавалі разам.*

*У маім архіве засталося ад гэтай працы шмат розных правак, машынапісаў, рукапісных варыянтаў.*

*Наш агульны сябра Мікола Канаш, які разам з Ларысай Антонаўнай быў у сталінскіх лягэрох, нядаўна даслаў мне лягэрную гэбісцкую газэту «Уголь Стране» н-р 19/24/ ад 14.05.1955 года. Там зьмешчаны, мусіць, адзіны рускі верш Генюш «Уголь» з пазнакай «на конкурс».*

Вспоминаю седую пургу.
Бесконечные снежные дали.
Чёрный уголь на белом снегу
В дни, когда мы его разгружали.

Бил нас ветер в лицо, как бичём,
Пробирался мороз в рукавицы.
В эти дни всё равно горячо
Мы с улыбкой умели трудиться.

Уголь - жизнь здесь в морозные дни,
Дар бесценный богатой природы.
Уголь - в тьме золотые огни,
Уголь - сила и мошость заводов.

Уголь - мчащийся быстро экспресс
И растенья в мороз по теплицам.
Уголь - свет и тепло, и прогресс,
И уют, и счастливые лица.

Вот рассыпался в чёрный узор,
На снегу лёг большими кусками -
Может быть, мой любимый шахтёр
Добывал их своими руками.

*На газэтцы «Уголь Стране» ёсьць толькі наступныя*

*рэквізыты: «изданае Политического Отдела», «редактор Б. П. Ионов», «за пределы подразделеная не выносить».*

*А потым прыйшоў яшчэ адзін ліст ад Міколы Канаша: з сапраўдным варыянтам верша Ларысы Генію ш, напісаным па-беларуску.*

**ШАХЦЁР**

Тае сьнег на шляхох і дарогах,
Сохнуць лужы на цёплым вятрэ,
Дрыжаць вусны вясьнянай трывогай,
Сонца душу ў абдымкі бярэ.

Можа быць, незадоўга прыдзецца,
Не сустрэўшы цябе, ад'язджаць.
Буду моўчкі, спыняючы сэрца,
Табе хустачкай белай махаць.

І вятрам раскажу на чужыне,
Прашапчу у нячулы прастор
Я ня раз тваё мілае імя,
Мой апутаны дротам шахцёр.

Ня раз мне, як палі Беларусі,
Як вясьняныя косы бяроз,
Будуць сьніцца салёныя вусны
І пралескі рассыпаных сьлёз...

Цяжка долі атрутай пярэчыць,
Калі ў вочы глядзіць аўтамат,
Буду верыць у радасьць сустрэчы
Ля радзімых замучаных хат.
А калі будзе нельга сустрэцца,
Буду верыць, - сынулька усё ж, -
Што хоць ты сваё вернае сэрца
Ёй, пакутнай, як дар, прынясёш.

Бо хачу, каб цябе калісь, мілы,
За твой шчыры змагарскі парыў
Беларусь, як сястра, прытуліла
Пахам ліп, шумам хваль, песьняй ніў...

А цяпер, калі зноў катаржане
Будуць моўчкі у даль ад'язджаць,
Табе, верны мой, на разьвітаньне
Буду хустачкай белай махаць.

*1954 год, Інта*

*Мікола Канаш даслаў свае ўспаміны пра лягэрнае жыцьцё: як яны з Ларысай Геніюш сустрэліся ўпершыню, дакладней, убачыліся зводдалеку праз драты, як ён на спатканьне прабіраўся колькі сот мэтраў пад зямлёй па шахтнаму штрэку, як пасьля адсядзеў за гэта ў карцэры.*

*Першы раз ён апавядаў мне пра гэта ў Зэльве 10 красавіка 1983 года, калі Ларысу Антонаўну адпявалі ў царкве, насупраць яе хаты, а мы выйшлі, каб хоць хвіліну хапіць паветра. Было балюча, горка, цяжка.*

*Шмат хто з былых вязьняў і занёмых Ларысы Геніюш здаваў у друк яе вершы - не заўсёды з належнай адказнасьцю. Радкі аднаўлялі па памяці, блыталі, гублялі, упісвалі чужое, не разумеючы сэнсу, вобразаў, падтэксту. І сама паэтка, і Мікола апавядалі мне, што ў лягэрох была такая дамоўленасьць вязьняў: пісаць лісты адзін другому,*

*як быццам ад закаханых, у гэтым выпадку менш было падазрэньняў, менш небясьпекі, што ліст затрымаюць. А пасьля той-сёй гэтай змушанай акалічнасьцю спэкулявалў - маўляў, меў «раман» з нашай паэткай.*

*Пасьля сьмерці Сталіна, прысуджаныя да 25 гадоў лягэроў, Ларыса Антонаўна й яе муж Іван Пятровіч да канца жыцьця былі ў Зэльве. Палову хаты, дзе жылі Генюшы, займала сямейка стукачоў. У Зэльве мала хто не супрацоўнічаў з КДБ - у заштатным мястэчку нават утварылі дзеля Генюшаў цэлы раённы адзьдзел гэтае канторы. Кожны шпіёніў, падслухоўваў, сачыў, бегаў з высунутым языком. Ужо ў аўтобусе з Ваўкавыску мяне нехта пазнаваў, суправаджаў да дзьвярэй, мігам прыбягала суседка што-небудзь пазычыць...*

*Калі Ларыса Антонаўна памерла, мяне раптам нейкія аматары паэзіі запрасілі выступіць у зэльвэнскай школе. З настальгіі я паехала... У класе сядзелі перапалоханыя дзеткі, кожны ў кулачку трымаў пісульку з падрыхтаваным пытаньнем - палова не магла выгаварыць правільна тое, што напісалі. Зьнішчаны дашчэнту зэльвэнскі люд сумаваў бяз працы... Нейкі раённы рэжысэр вырашыў паставіць спэктакль на тэму «Народ не с вами, а с нами»!. Тыя дзеткі вырасьлі ў перакананьні, што «ничаво не даёт эта ваша Беларусь, кромя дурной мовы». Зрэшты, хай падзякуе сваім настаўнікам, праз якіх будуць сьлепа верыць у Расею й плаціць за гэта да канца сваіх дзён на зямлі. Гэта мёртвае пакаленьне.*

*А калі аж у 1991 годзе менскае тэлебачаньне здымала ў Зэльве тэленарыс пра Ларысу Генюш (і я таксама паехала, каб яны там чаго не наблыталі), то ... ўбачыла тое самае, што дзесяць гадоў таму. Лёталі суседкі, абарачваліся на вуліцах... У зачыненай рэстарацыі, куды менчукі й мы трапілі на абед праз угаворы начальніцы, раптам аднекуль зьявіўся сьціплы малады чалавек і, не змаргнуўшы, піў піва, гледзячы ў наш бок. Кантора працавала далей.*

*Ларыса Генюш была б завялікай нават для сталічнага мястэчка Менску - што ж гаварыць пра Зэльву! Неяк я падпісала зэльвэнскаму хлопчыку сваю кніжку «Ты - гэта ты» з пажаданьнем вырасьці сьмелым і сумленным, як Л. Г. Спачатку ў Зэльве, потым у Гародні адразу ж пазьбіраліся бальшавіцкія сакратары: ну што рабіць з гэтай Данутай?! Яна ж нам дзяцей распускае! І доўга-доўга мяне не дапускалі ні да якіх дзяцей, хаця й працавала я сама настаўніцай. У гэты ж час сын Ларысы Антонаўны Юрка перанёс апэрацыю на страўніку, ляжаў у бальніцы ў Польшчы. Па тэлеграме, падпісанай хірургам, за мяжу пускалі нават тады на працягу сутак. Але калі Ларыса Антонаўна прыехала ў абласны ОВИР, сакратарка пачала адразу яе выхоўваць, як гэта яна пасьмела адмовіцца ад грамадзянства «такой чудесной страны как СССР». Паехала ў Міністэрства замежных спраў БССР - тое самае. Плакала тады Ларыса Антонаўна не за сябе - за Беларусь, дзе напладзілася столькі здраднікаў... Генюш мела савецкі пасьлялягэрны пашпарт са штампам «без гражданства» і паметай, што апошняе грамадзянства чэхаславацкае – дарэчы, хто «пазбавіў» яе чэхаславацкага грамадзянства? Ва ўсялякім разе, не ўрад Чэха-Славаччыны. На прапановы прыняць грамадзянства СССР і ўступіць у «саюз» пісьменьнікаў, гэтак мовячы, залегалізавацца,*

*Ларыса Антонаўна ня раз адказвала, што хутка ўжо яна ўступіць у той саюз, дзе Купала, Цётка і Багдановіч.*

*Але Ларыса Геніюш і яе хата, як сонейка, прыцягвалі ўсё яшчэ жывое на Беларусі - пісьменьнікаў, мастакоў, навукоўцаў, сялянак. Можа, мы й не памерлі ў 60-80-я гады, таму што на злосць «жлобскай нацыі» здраднікаў і самалiквiдатараў стаяла ў Зэльве ўся ў кветках вясновая хата й пісала вершы паэтка. І ўсе бітыя, пакрыўджаныя, параненыя знаходзілі той ганак удзень і ўночы, стукалі ў сенцы, не зважаючы на суседку, якая бяссонна стаяла на варце ў суседніх дзьвярох. Іх там кармілі, адпойвалі, суцяшалі словам. На дні нарадзінаў зьбіраліся, бадай, усе хто гаварыў па-беларуску - і стукачы «беларускамоўныя» таксама. А ў гародчыку за хатай вырастала й хапала на ўсіх, на ўсю тагачасную Беларусь - памідораў, гуркоў, яблыкаў, ягадаў і кветак. З пустымі рукамі й душамі адтуль ня ехаў ніхто.*

*І вершы ехалі. А чаго іх было трымаць дома? Не для савецкага ж друку яны ствараліся...*

*Цэлы так спраўны БНФ, увесь адраджэнцкі друк пачыналіся ў Зэльве. Былі там Зянон Пазьняк і яго будучы намесьнік Юры Хадыка, быў цяперашні сацыяль-дэмакрат Алег Трусаў, адзін зь першых «самвыдатчыкаў» Уладзмір Арлоў, будучы выдавец «Навінаў», «Свабоды», а цяпер «Нашай Нівы» Сяргей Дубавец, яго калега паэт і перакладчык Алег Мінкін. Калі Ларыса Антонаўна памерла, мы яшчэ доўга знаходзілі адзін другога праз яе, Нашу Духоўную Маці.*

*Нас было, аказваецца, ня так і мала. І такое выпала шчасьце - мець яе. Што ж я - з дапатопнае дзікай напаўлясной вёскі, дзе толькі што размаўлялі па-беларуску, прыехала пасьля педвучылішча ў Гародню, ведаючы адны савецкія кнігі ды па-польску прачытаўшы Міцкевіча й трылёгію Сянкевіча; зялёнага паняцьця ня мела пра расстраляны народ, расстраляны мяккі знак... З нашай вёскі йшлі ў партызаны і ў АК, але ў лягэр ніхто ня трапіў, аможа, бацька ня ўсё мне гаварыў. У Зэльве пачула пра БНФ, Вінцука Захарку і... Цанаву.*

*Мы, хто яе любілі, разумелі тады ня ўсё. Скажам, я была залішне вясковай і савецкай, цягнулася да яё неяк інстынктыўна. Гэта як заблукаеш у ягадах і ня памятаеш, у якім баку вёска, ня ведаеш, кудыісьці й кружыцца галава... І з кожным крокам нарастае няпэўнасьць - а можа, ідзеш не туды? А потым выходзіш на знаёмыя сьцежкі, потым поле й за ім вёска...*

*Сама Ларыса Геніюш лічыла сабе яцьвяжкай. Апошняй адзінкай загінуўшага народу. І гэта сапраўды было так. Але, аказваецца, што ўсё жывое мае шанц, нават пасьля сьмерці. Калі нехта з апошніх біўся за сваё да канца.*

Данута Бічэль

*Гародня, 25 сакавіка 1992 года*

* * *

Мужыкамі нас клічуць і хамамі.
Мазалі на нашых руках.
Наша вопратка саматканая.
Нашы здраднікі ўжо ў панах.

Нам — рыдлёўка, сякера, кельма.
Ім — бізун, каб нас паганяць
і тапіць у хлусьні пякельнай
і зь зямлі наш род карчаваць.

Век дваццаты — ня час Батыя,
досыць нішчыць нашых сыноў.
Беларусы цяпер ня тыя —
навучыліся біць паноў,

біць чырвоных паноў да скону,
што з народнай крыві жывуць.
Беларусам даволі прыгону!
Беларусы на ногі ўстаюць.

Душы чыстыя, як на споведзі,
за жыцьцё ўстаюць для жывых.
Не дамо больш глуміцца з моладзі.
Не дамо ім сыноў сваіх!

* * *

Зашчымела мне сэрца ў грудзёх,
сум сьлязой засланіў мае вочы.
Я ступіла ізноў на парог,
які мне адабралі аднойчы.

Беларускае марыва слоў.
І кахаючых сэрцаў бясьпечнасьць.
Тут жыве дабрыня і любоў,
і ў суровыя дні - чалавечнасьць.

Быццам сыпнула шчасьцем зь нябёс,
нашым, вечным,нязгасным, нятлённым.
Прыпаду да зямлі ў зяньні рос,
у якой маіх продкаў мільёны.

Над сьцяжынамі шум баравы.
Вокал вёскі - жыцьця асяродкі.
Бітваў водгалас чую ў крыві,
што славутыя выйгралі продкі.

Упіраюцца вочы ў муры
шматвяковых трывалых сьвятыняў.
Гэта ты, мой прапрадзед стары,
на зямлі сьлед унукам пакінуў.

Непахісныя сьцены стаяць.
Час іх зубам сваім не кранае,
бо ты ўмеў і любіў будаваць,
ведаў: мур твой набегі стрымае.

Быццам голас ваш чую з глыбінь:
паўстаюць змагары і героі

www.kamunikat.org

будаваць, сеяць хлеб і любіць
і трымаць нагатоў сваю зброю.

З працы, з поту вы цяжка жылі,
шмат чужынцы ад вас адабралі.
Нейкім цудам на гэтай зямлі
родны край вы для нас захавалі.

Усё было - і палон, і прыгон,
і змаганьне, і сьмерць, і адвага.
Нізкі сяньня тым продкам паклон
за жыцьця пераможную прагу.

Чыста ў долах, салоўка пяе,
у прысадзьдзі дамы задрамалі.
І кладзецца на плечы мае
ўся зямля, што яны захавалі...

*1981, студзень*

* * *

Памутнелыя вочы ў тузе...
Так бы бегчы ў палі, ня спыняцца.
Сабака на ланцузе,
жалезны ланцуг на сабацы.

Назаўсёды стрыманы бег,
век ланцуг цягаць давядзецца.
Жаласьлівы сабачы брэх
не кранае людзкога сэрца.

Брэша — б'юць і ня брэша — б'юць.
Дзень і ноч — туга, адзінота.
У чарапок недаедкаў нальюць...
Так на волі пабегаць ахвота!

Бег кароткі сабачых дзён.
Дагараюць сны маладыя.
Ланцуга глухі перазвон
на нявіннай сабачай шыі...

*люты, 1981*

www.kamunikat.org

## БЕЛАРУСКА

Калі цябе, мілы, краіна пакліча
за родны змагацца парог,
то суму ня будзе ў мяне на аблічччы,
ні страху ня будзе ў грудзёх.

Дзявочае сэрца ў хвіліне так важнай
ніколі тады ня ўздрыгне,
а буду ня менш за цябе я адважнай,
каб сілы дадаці табе.

Бо сэрца дзяўчыны пад кужалем тонкім,
як і сэрцы найлепшых сыноў,
гарыць то ж каханьнем да роднай старонкі
і спадчыны нашых дзядоў.

Ты пойдзеш у бой, а я плуг пакірую,
каня накармлю, напаю.
І так абаронім, засеем, збудуем
Беларусь дарагую сваю.

Бо гэтак, як стрэльбы і кулі як звонкай,
як сіняе сталі ляза,
заўсёды патрэба для нашай старонкі
адважных хлапцоў і дзяўчат.

*1940*

## УСЁ РОЎНА МНЕ

Усё роўна мне - ці сьмерць, ці серп двурогі
ўглядацца будзе ў сонную ваду, -
нат у труне я са сваёй дарогі,
з дарогі беларускай ня сыйду...

Ня дом, а лягер, не пасьцель, а нары.
Вакол натоўп, а чалавек - адзін.
І сон - ня сон, а толькі солад мараў,
далёкі і засмучаны ўспамін...

Ужо шэсьць год, як пад замком іржавым
іржавыя цякуць за днямі дні.
А боль наш служыць злыдням для забавы,
а сьвятасьць праўды топіцца ў хлусьні.

Забыты сьмех. Тут сум у кожнай песьні.
У дзікай тундры вечны плач бязь сьлёз.
На крыльлях дум - пакутаў сьлед, як плесьня.
Усё ў вачах, што з болем перанёс.

І цемень прорвы, жах ад праўд расьпятых.
І ўзьлёт надзеяў ясных праз драты.
І сумна, што замест пяра - лапата.
І так шкада, што мучацца браты.

Той самы штык учора, сяньня, заўтра
ў руках людзей, чыя малітва - зьдзек.
Той самы бой з той сілаю упартай,
зь якой жыцьцё ратуе чалавек.

Ня раз душа зьляцела б з сумных вуснаў,
лягла б замерзлай птушкай на мароз,
калі б ня ведаць, што для Беларусі
такой дарогай йсьці назначыў лёс.

www.kamunikat.org

## ЗЬ МІНУЛАГА

Сілаю ў сеці злоўлена.
Краты ўсё і ланцугі.
Сэрца маё перапоўнена
горам празь берагі.

Крыўда ўзьвіваецца полымем,
здаецца, з прадоньня пяшчэр.
Зь пекла ўпала на голаў мне
ўся гэта СССР.

У змаганьні, ў цярпеньні, за кратамі
адна, заўсёды адна,
у праўдзе сваёй заўзятая,
рукі ламлю давідна.

Скаргі аднак ня вымаўлю,
болю ня знаю, бадай.
Выцерплю, ў Бога вымалю
волю табе, родны край.
1964

## ВЫЙШЛІ СЯНЬНЯ

Выйшлі сяньня з палосак мы вузкіх
маладою адважнай сям'ёй
бараніць родны край беларускі
сваёй сілай, сваёю крывёй.

Годзе нам ужо зьдзекаў і мукаў,
пад чужым годзе гнуцца ярмом.
Сяньня ў нашы юнацкія рукі
долю роднай краіны бяром.

Йдзем праз сёлы бадзёрым мы маршам,
з намі сьледам уздым маляды...
Звонкай песьняй братоў усіх нашых
ў беларускія крочым рады.

Б'юць нам ветры ў юнацкія грудзі,
цьма чужая блытае паход -
ўсё ж мы родныя сёлы разбудзім,
ускалыхнем сакаліны народ.

Нас ніхто больш ужо ня прымусіць
слухаць зьдзекі прыблудаў чужых.
«Хай жыве наш народ беларускі!» -
кінем кліч ад мяжы да мяжы.

Сярод бураў стыхіі сусьветных
мы сягоньня ў імклівых радах.
Беларусь - гэта нашая мэта,
а над намі крывіцкі наш сьцяг.

*1942 /?/*

www.kamunikat.org

## ЧУЖЫНЕ

Нэонавым, такім рэклямным вечарам
шляхом сваіх неўтаймаваных дум
о, край чужы, я да цябе з даверам
ужо ніколі болей ня прыйду.

Славяне славяцца адвагаю, гасьціннасьцю
ці грамадзянскай мужнасьцю, як мы.
Славянкі - шчырай цеплынёю, літасьцю.
Пра Юду - гэта не славянскі міф.

Твой пыл мне з ног у вязьніцы асьшаўся,
да сэрца ж ён ніколі ня прыстаў.
Няелаўна ўсё, што строга і бязьлітасна.
Людзкая вартасьць - мера велькіх спраў.

Нягадана мне на шляху сустрэчаны,
прадаўшы ў путах душу не адну,
чужы, ня братні, зь людзкасьцю разьвенчаны, -
я да цябе ніколі ня прыйду.

*1956*

## ПРАЧНУЛАСЯ Ў НЯВОЛІ ЦЕМНАТЫ

Прачнулася ў няволі цемнаты...
Здаецца зноў пад'ём па рэйцы звоняць.
І сэрца скручваюць калючыя драты,
і анямелі ад кіркі далоні.

Не, гэта не сабакі, не канвой.
Блукае ў небе месячная поўня.
Зладзейскі шорах за маёй сьцяной.
Сусед падслухвае, што гавару праз сон я.

А на рагу стаіць другі - блатны,
і людзям страх начамі наганяе.
Вартуе па-сабачаму куты,
каб не ступіла тут нага чужая.

Каб з паднябесься не зьляцеў арол,
знарок не заглянуў у нашу клетку,
не расказаў пра мой крывавы боль
і ня прынёс ад мілых брацьцяў вестку.

Чужыя вокны ў вокны мне глядзяць,
празь іх за мной і дзень і ноч вартуюць.
Нас прадаюць за юдавы мядзяк.
І праз фіранкі нас фатаграфуюць.

Мы гутарым - і чуюць груганы.
Я кашляю - і груганы сьмяюцца.
Атруту зь ежаю нам шлюць яны.
І што яшчэ жывем, яны злуюцца.

Дзе я ні йду, за мною сьлед у сьлед

з тупой пагрозай нечаканай сьмерці
ідзе, цікуе жудасны сусед
ці нейкі цень пад сьценамі крадзецца.

Сялянка сьціплая ступіла ў дом,
сялянскай працаю крыху прыгнута, -
сьмятаны слоік падала, а ён
для нас, душой даверлівых, - атрута.

## НАД НАРОДАМ
## ЎСЁ ЧУЖЫЯ БОСЫ

Над народам ўсё чужыя босы
і сьцягі чужыя ў вышыне.
А народ, як рыба, безгалосы
моўчкі карак перад імі гне.

А народу сьніцца сваё поле,
што і ён удома гаспадар.
А народу часам сьніцца воля,
як нябёсаў найсьвяцейшы дар.

Усё сьніцца, што ён сам засеяў
на вясну свой хлебаробны край.
Ды за працу вырасьце з надзеяй
блаславенны ўласны ураджай.

Песьня сьніцца родная і мова,
што ад маці з малаком ўвабраў,
і бяседы вечарам зімовым
клопаты ля гаспадарскіх спраў.

Працаваць - было б на чым! - ня цяжка!
Зажынаць сваё яшчэ лягчэй.
І здаецца ўсё далёкай казкай:
гаспадарка, чарада дзяцей.

Сяньня дзеці ў свет ідуць і гінуць.
Не туды адзіны сын пайшоў.
Нат імя няма каму пакінуць.
Стала пуста на зямлі дзядоў.

* * *

Ужо вятры мяне наскрозь прадзьмулі
хоць яшчэ й не звалілі з ног.
Ня клічце мяне бабуляй,
прыходзячы на мой парог.

Бабулі сумуюць ў куточку,
ўжо свабодныя ад турбот,
абапёршыся на кіёчку,
вітаюць сыноў ля варот.

Бабулям ня чыняць болю,
ім людзі дораць спакой.
Бабулі сядзяць пад касьцёлам
з выцягнутай рукой...

Бабулі зьдзекаў ня знаюць,
пад ударамі ня жывуць.
Бабуляў не распінаюць.
Словам паганым ня тнуць.

Бабулі ідуць на спачынак,
каб заўтра спакойна ўстаць,
за кожны шляхотны ўчынак
ад жаху ўначы ня дрыжыць.

Бабулі гора ня знаюць.
Да іх справы няма камусь.
бабуляў не дакараюць,
што любяць яны Б е л а р у с ь .

Бабулі чакаюць сьмерцІ
ля ўнукаў і ля сыноў.
Бабуляў ня раняць у сэрцы
на схіле сталых гадоў.

Калі бабулі ўміраюць,
ніхто іншы, толькі сыны,
усё па іх забіраюць,
што прыдбалі ў жыцьці яны.

Вы мукаў маіх не адчулі,
умею насьмерць пастаяць.
Не, я пакуль не бабуля -
Ларыса Гэніюш - я.

У час цяжкое агоніі,
калі мучаць людзей ні за што,
бабуляў нехта бароніць,
мяне ж не бароніць ніхто...

Гэтак мучаных больш не сустрэнеш,
ды няма такіх навакол.
Так, я - Ларыса Гэніюш.
Імя гэта сёньня, як боль...

Ёсьць такія два Хлопцы рослыя,
на іх цень імя майго лёг.
Вораг глуміцца над іх вёснамі,
ўсё ж пакуль сьцеражэ іх Бог.

Мо, ня будуць яны Кастусямі,
ўсё ж душы іхняй не сагнуць.
Будуць вернымі беларусамі,
імя майго не прададуць!

Маё сэрца, як гусьлі, чулае.

www.kamunikat.org

Моцны норавам мой Пэгас.
Дык ня клічце мяне бабулю.
Прада мною суровы час.

Бабулі зла ня стрываюць,
зальюцца ў бядзе сьлязьмі.
Удараў яны ня спыняюць
ў сэрцы ўнукаў сваімі грудзьмі...

*1982*

## АРЛЫ ТОЛЬКІ ПРАГНУЦЬ ЛЁТУ

Арлы толькі прагнуць лёту.
Іх крыльлям цесна ў аковах.
Спакойна, напаўдрымотна
жуйку жуюць каровы.

Ці сонца, ці месяц у поўні,
ці вецер б'ецца аб сьцены, -
ім толькі стойла ды пойла,
у жолабе болей сена.

Толькі мычаць часамі,
калі ім сьніцца дуброва.
Гатовы бароцца рагамі
з воляю пастуховай.

Бураць засекі, бы краты,
як людзі крышаць кайданы.
Бягуць да свіх цялятаў,
сілаю адабраных.

Каровы, болем рычэця,
хоць любіць пастух спакойных,
а тых, што плачуць па дзецях,
за рогі вядзе на бойню.

Сьвет, белы сьвет - не пустыня.
У ім яшчэ людзі вартуюць.
І голас адчаю ня згіне,
бо крык ваш недзе пачуюць.

Будзе трава і дзеці,
дабра і корму сьвет поўны...
Рычэця, мацней рычэця, -
ня ўсіх давядуць да бойні.

www.kamunikat.org

**ЖЫРОВІЦЫ**

Прыехаць у Жырова лёс мне выпаў,
дождж хрысьціць голаў грэшную маю.
І я пад гольлем шматвяковай ліпы
пільгрымам сьціплым сьцішана стаю.

Сьвятыні побач белыя, як дзіва
ў абдымках хмараў і высокіх дрэў.
Ідзе сьвятар, бы галубочак сівы,
стаміўшыся, на лаўку хтось прысеў.

Сюды травой, аброшанай і мяккай,
на цудатворны пераможны кліч
йдуць людзі з горам, болем і падзякай.
Людзкія душы ачышчае зьніч.

Перада мной зямля наша сьвятая.
Тут у паклоне дрэвы над вадой,
дзе галубы бясшумна пралятаюць,
ступала Маці Божая па ёй.

Ня знатныя, а пастушкі віталі.
Прыйшла да нас ў вясьняны дзень знарок,
і краю міламу, каб лепшымі мы сталі,
пакінула на дрэве абразок.

Над намі храм, туманныя нябёсы.
Крынічанька пад храмам б'е зь зямлі.
Як пастушок ў кашульцы белай босы,
стаю, і сьлёзы твар мой залілі.

Адданасьцю стукочуць нашы сэрцы
з крыніц благаславенных праўду піць.
Мінуласьці сьвятой зь зямлі ня сьцерці
і веры ў Бога ў сэрцы ня спыніць.

Жыровіцы, славутая мясьціна,
здаўна праложаны для нас дзядамі шлях.
Малітвы боль ў нялёгкаю хвіліну
мы на тваіх складаем алтарах.

Хай будзе мір ды згода будзе ўсюды.
Ды калі грозьбай азарыцца сінь, -
нашай зямлі, дастойнай Тваіх цудаў,
ў сваёй апецы, Божа, не пакінь!

*1981*

www.kamunikat.org

* * *

Моладзь ідзе няпэўна,
моладзь - калінавы куст,
у пошуках долі дарэмнай
крочыць мая Беларусь.

Песьня гучыць над імі,
кліча, гоне ўпярод!
Паціху другія гімны
нявольны пяе народ.

Моладзь пад муштру крочыць.
Сумны замкнуты круг.
Моладзь, дзе твае вочы?!
Перад табой Беларусь!

Моладзь праходзіць моўчкі.
Узьлёт бы! - ня крок тупы!
Моладзь, народ свой топчаш!
На сэрца не наступі!

## ШЛЯХ

Той шлях - як ноч, бы крык балесны.
Люд у цярпеньні і ў журбе.
Той шлях - бы радасная песьня,
таму што шлях наш - да Цябе.

Праз тундру, скованую лёдам,
дзе вуснаў замірае ўздох,
шлях да Цябе - як наеалода,
бы траўнем крочыць па садох.

Празь белы сьнег і чорны вугаль,
паўночнай гнаныя пургой,
мы ўсе - з-над Нёману, з-над Бугу
скрозь боль
ідзем к Табе адной...

*1950*

www.kamunikat.org

* * *

Бацькаўшчына, зямля дарагая,
гдзе лёс дазволіў роду ўзысьці.
Ніхто з нас бацькаўшчыны не выбірае,
як не выбірае маці у жыцьці.

Любім такую, як нас нарадзіла
і ўскалыхала праcторай зямлі.
Усё на ёй наша, ўсё на ёй міла
карэньнем, таму што ў яе мы ўрасьлі.

Куды б ні закінуў лёс вернага сына,
у сьвеце ён родных ня знойдзе братоў.
Моцна трымае зямлі пупавіна
сэрцы людзкія і кліча дамоў.

* * *

На працягу шматлікіх вякоў
людзкой цемры, ўзаемнага зьдзеку
намагаліся тысячы мудрацоў,
як з малпы зрабіць чалавека.

Чэрпалі мудрасьць з прачыстых крыніц,
з душы найсьвяцейшых вытокаў,
каб розум, сумленьне ў людзей абудзіць,
на сьмерць йшлі сьвятыя прарокі.

Неператможнае скопішча зла,
цемры людзкой першароднае.
Калі ўчора з дубінаю малпа была,
яна сяньня ўжо з атамнай бомбаю.

www.kamunikat.org

* * *

Дзіўны час, і збываюцца мары.
Волі сьпеў на тамтамах тугіх.
Устаюць белыя, чорныя твары
з адным колерам сэрцаў людзкіх.

Нада мною столь з дошак і бэлек
прагляне на бярвеньнях крутых.
Тырчаць гакі старых калыбеляў,
ноч мінуласьць калыша на іх.

Ужо замест буркатні калаўрота
пад агонь і патрэскваньне дроў -
аб кудзелях, аб белых палотнах
сьпікер гутарку ў радыё вёў.

## ДАРАЖЭНЬКІЯ, БЛІЗКІЯ, РОДНЫЯ

Даражэнькія, блізкія, родныя -
Боль адзіны, супольны лёс!
У сэрцы звоняць званы Велікодныя:
Уваскрос! Уваскрос! Уваскрос!

І ў дакор рэчаіснасьці шэрай,
што панура прад намі ляжыць,
поўніць грудзі нязломная вера:
Будзем жыць!
Будзем жыць!
Будзем жыць!

www.kamunikat.org

* * *

Шукаючы звонкай бунтарнай паэзіі,
у сэрца паэта з нагамі ўлезьлі.
Паэзія з духу толькі, бязь цела, -
ад рук паганых вышэй узьляцела.

Яе зрадзіла сэрца з пакутаў.
Вольнага слова жахам ня спутаць!
Няземскай сілай, сьвятлом праб'ецца!
Праўдай і верай запаліць сэрца!

*1982*

* * *

Сто ямін на пакутны шлях,
сто пасткаў вораг мне паставіў.
Ды скарбаў праўды, што ў грудзях,
нат страшны лёс мне не расплавіў.

Падбіты крыльяў сьмелы ўзмах.
Кайданны зьдзек нутро скрывавіў.
Ды скарбаў праўды, што ў грудзях,
нат страшны лёс мне не расплавіў.

www.kamunikat.org

* * *

Ня плачце над маім крылом,
што ападзе зь пляча бясьсільна.
Вас не марозілі жыўцом,
на чвэрць стагодзьдзя не судзілі.

Для тых сьпявайце салаўём,
што душу, мову вам зглумілі.
Вас не марозілі жыўцом,
на чвэрць стагодзьдзя не судзілі.

* * *

Змыты дажджамі дзявочы мой сьлед.
Птушкаю песьня з гнязда адляцела.
Сядзіба мая, дзе я ўбачыла сьвет...
Ад магілаў душа анямела...

Роднаму вернасьць - дзядоў запавет.
Руіны маўчаць, быццам мёртвае цела.
Сядзіба мая, дзе я ўбачыла сьвет...
Ад магілаў душа анямела...

www.kamunikat.org

* * *

Лёс мой пакутны і век мой даўгі.
Сьвечка жыцьця дагарае ўдома.
Здаецца яшчэ ўсё зьвіняць ланцугі
на тонкіх руках, як і некалі ў Комі…

Я ня крыўдую, мой край дарагі,
са сталі стварыў ты мяне, не з саломы.
Здаецца яшчэ ўсё зьвіняць ланцугі
на тонкіх руках, як I некалі ў Комі…

* * *

Нэрвовы плач, нэрвовы сьмех,
і неба хмурыць бровы.
Нэрвовы нат сабачы брэх.
I цэлы сьвет нэрвовы.

Плянуе нехта сьмелы ўзьлёт
і думае - ці варта?
Працуе сяньня ўвесь народ.
А што чакае заўтра?

www.kamunikat.org

* * *

Ты - пан зямлі, я - пан свайго сумленьня,
і нада мною ты не валадар.
То за табою крыўда пойдзе ценем
і будзе мсцыць разбураны алтар.

Дык ты дрыжы паміж здаўнелых страхаў,
каб змыць віну, шукай у сэрцы слоў.
А я пайду. А нехта ціха скажа:
- Вунь чалавек дарогаю пайшоў.

*1964*

* * *

На мозг кітайцы капалі вадою,
і вар'яцеў той чалавек пасьля...
О, чалавек! Што ж робіцца з табою,
калі дзяўбе твой бедны мозг хлусьня.

* * *

Жыцьцё бяз болю не прайсьці!
Пакут замнога у жыцьці.
Пакута ж горшая за сьмерць -
то маскаля на сэрцы грэць.

* * *

Не хачу быць дома эмігрантам!
Гаспадыня тут я - а ня госьць!
Гаварыць на дзікім «эсперанта»,
калі мова матчыная ёсьць?!

* * *

Ужо даўно адабраў тамагаўкі
сыном поля няпрошаны госьць -
ўсе сабакі па-іхняму гаўкаюць,
бо за гэта кідаюць ім косьць.

* * *

... ўрываемся ў чужы спакой...
Бязьлітасна гартаем кнігу-памяць...
Дык асьцярожна ля душы людзкой,
каб дотыкам суровым не параніць...

www.kamunikat.org

* * *

Далі табе нямала чарак
на твой нацыянальны сон,
народ сьвінарак і даярак,
народ разяваў і варон.

* * *

Калі лёс мяне злы прыгнятае,
і нясьцерпны боль на душы,
я заўсёды у сэрца пытаю:
што зрабілі б мае Генюшы?

* * *

Гаварыць па-беларуску гэта модна.
Мовы маці кажуць не забыць.
Для мяне ж гэта ня модна - толькі родна.
Гэта - так, як піць, як есьць, як жыць...

* * *

Трывога. Стукоча сэрца.
Кусаю вусны да болю.
На дрэве галінка гнецца.
Сэрца паэта - ніколі.

* * *

Ты не пішы мне болей, дарагая,
даволі цяжкі беларускі крыж.
Я ведаю, як страх перамагае
і за лёс дзетак сэрцам лекацiш.

Сардэчна я й са сьвятам вас вітаю,
каб вам ўсю радасьць Новы год прынёс.
Жыві,твары і цешся, дарагая,
у кожнага свой асабісты лёс.

Дзякуй за крык твой, мілая Дануся,
гдзесьць з чыстых нетраў, з глыбіні душы.
Ня лёгка жыць на роднай Беларусі
і вось таму мне болей не пішы.

Жыцьцё людзкое коратка трывае.
Дарогі нашы праляглі наўскрыж.
Я ведаю, як страх перамагае
і за лёс дзетак сэрцам лекаціш...

*27.12.1975 Зэльва*

www.kamunikat.org

* * *

Не жыцыдём напоўнены дзень да краёў.
Жыцьцё - люты бой, і адсюль тысяча жалаў
у хворае сэрца ўпіліся маё...

Дзед мой і прадзед такога ня зьведаў,
хоць і жылі яны многа гадоў:
стаю адна пасярод людаедаў
і пяю ў забыцьці, як дзіця, пра любоў,
сьмерці самой не баюся пярэчыць
сваім жаночым натхнёным пяром,
якім змагаюся за чалавечасьць
зь нелюдзьмі, з подлым чырвоным злом...

А там, за плячыма, крадуцца Юды,
а там, насупраць, забойцы стаяць -
і дзень за днём толькі зь веры ў цуды
жыву, каб выстаяць, каб не прапасьць;
Ірады зноў шукаюць дзіцятка,
забіваць па загаду кожны гатоў,
а я з Хрыстом іду, як зь ягняткам
наўстрэч ашчэранай зграі ваўкоў,
дзе перакрылі кругом дарогі,
вартуюць кожны жаночы крок -
іду праз мукі й зьдзек без трывогі,
і кожны дзень, як новы астрог...

Юды кругом выпаўзаюць, як зьмеі,
на нявінную душу агідна шыпяць,
а я перад імі хістацца ня сьмею,
тут бой за народ, і я мушу трываць;
бачу, вось набліжаецца Каін,
бачу, вораг зьбівае мне гроб,
толькі лічу кожны кінуты камень,
кінуты ў чысты жаночы лоб,
сэрца маё ціхі жаль атуляе,
ночка сумная думкі прадзе,
што нават у любым некалі краі
няма болын сяброў і няма людзей -
падумалі добра і мыюць рукі,
паціху здраджваюць больш і горш:
з пакутаў маіх, з усіх маіх мукаў
зарабляюць паганы юдавы грош...

Божа, тут некалі ў кожнай хаце
біліся сэрцы старых Крывічоў!
Дай не спыняцца мне, дай не спыняцца
люду з-над Нёмна пяяць пра любоў,
каб чалавек бяздушнай машынай
ня быў, а быў сабой чалавек -
няхай маё слова квітнее шыпшынай,
жывой калінай ля ціхіх рэк,
і ў гуле шумных чужацкіх парадаў,
дзе душна ад пылу, зброі ды зла,
жыве маё слова пра людзкасьць і праўду,
што калісь па вёсках забытых жыла!

Паэт - гэта птах, крык душы летуценнай,
а крыку ня можна зьдзекам спыніць,
ніколі арлы не стаяць на каленях,
арлінае слова й па сьмерці гучыць...

www.kamunikat.org

## МОЛАДЗІ

Гэй, зьбірайцесь, крывіцкія дзеці,
пад народны, пад горды наш сьцяг!
Воля краю нам зоркаю сьвеціць,
яго шчасьце - у нашых руках!

Мы за волю крывіцкіх прастораў,
мы за спадчыну нашых дзядоў
аддамо, каб насыціўся вораг,
жыцьце наша і нашую кроў.

Але краю, што Нёман галубіць,
гэтых сэрцаў, што воляй гараць, -
ўжо ня будзе арол крывадзюбы
да крыві пазурамі зьдзіраць.

Нам ня страшны сібірскі больш холад,
нам ня страшны маскаль або лях,
чужы серп не патрэбны, ні молат -
мы разгорнем крывіцкі наш сьцяг!

Нашы сэрцы гімн родны зайграюць!..
Адгукнецеся сёлы ў вадказ!
Мы нясём жыцьцё наша для краю,
мы нясём жыцьцё наша для вас!

Станем дружна ўсе брат каля брата,
абаронім Краіну грудзьмі,
воля будзе вялікай заплатай
за нягоды цяжкай барацьбы!

*Прага, 1942*

## НАШ СЬЦЯГ

Ня слава краю, ўздым магутны...
нат ня шумелі мне сьцягі...
Заместа іх зьвінелі путы
і цёмнай ноччу ланцугі.

Заместа водгульля Пагоні
яшчэ сягоньня, як крумкач,
у набалелым сэрцы звоне
жанчыны беларускай плач.

Дзявочы твар, бляды ад жалю,
дзяцей спалоханы пагляд
і кроў братоў, што бунтавалі -
я толькі гэткі знаю сьцяг!..

За жар душы, што набалела,
за сэрца зораны агонь,
я, Божа, чуць хоць раз хацела б
шум сьцягу вольнага свайго.

Калі Крывіцкая зямліца
мне сэрца гордае саўе,
а польны вецер расшуміцца,
на разьвітаньне запяе, -

няхай разгорне свае крыльлі,
як сторож вечнага жыцьця,
хай зашуміць хоць на магіле
мне бел-чырвоны-белы сьцяг.

*Прага, 1942*

www.kamunikat.org

Юрка Геніюш

# ДА СВЕТУ

www.kamunikat.org

Выбраў і да друку падрыхтаваў Сакрат Яновіч

*ПРАДМОВА*

*Юрка Геніюш пісаў мала, нядужа пакінуў у спадчыну існа літаратурных твораў. Больш займаўся публіцыстыкай, якая, як вядома, рэдка вытрымлівае выпрабаванне часам. Засталіся па ім — колькі вершаў, нізка паэтычнай прозы, трохі апавяданняў, некалькі п'ес (для дзіцячай сцэны перш за ўсё). Неапублікаванага пры яго жыцці не так шмат, аказваецца. Амаль усё ўдавалася прыхільным яму рэдактарам, раней або пазней, праціснуць цераз цэнзурныя сеці; змяняліся эпохі і крытэры палітычнай пільнасці ў пісьменніцкіх жандараў.*

*Будучаму выдаўцу поўнага збору твораў Юркі Геніюша трэба канцэнтравацца на старонках „Белавежы" у тыднёвіку „Ніва", на „Беларускіх календарах" і альманахах. Намаганнямі Літаратурнага клуба Саюза польскіх пісьменнікаў у Беластоку, напрыканцы сямідзесятых гадоў быў выпушчаны бібліяфільскі зборнічак ягонай паэтычнай прозы, менавіта той, з якой не даваў ён рады прабіцца ў белы свет друку.*

*Значэнне пісьменніка не залежыць ад лічбавай прадуктыўнасці. У гісторыі літаратуры, таксамаі беларускай, ёсць скромныя на першы выгляд кніжыцы, якія выклікалі пералом.*

*Творчы почырк Геніюша пазнаць адразу. І адно гэта ўжо сведчыць пра высокую арыгінальнасць яго таленту, непаўторнасць.*

*Ён — з першага пакалення аўтараў „Белавежы", якое блізу ўсё ўваходзіла ў літаратуру па-сірочаму цяжка; мерытарычна непадрыхтаванае і без адэкватнага гэтаму працэсу культурнага заплечча. Відаць па тагачасных публікацыях „Белавежы" і*

*невялікую лектурную дасведчанасць, лексічную беднасць тэкстаў, варварызмы і фальклорны ўзровень слова. Але так заўсёды, калі нешта пачынаецца на пустым месцы; у „Белавежы" не было буйнага фармату папярэднікаў, нават акуратна адукаваных інтэлігентаў, якія маглі б быць найпершымі кампетэнтнымі чытачамі дэбютаў (аднаго-адзінюткага Георгія Валкавыцкага як жа мала!).*

*Здавалася б, здольнасцям Юркі Генюша пашанцавала толькі разгарнуцца ва ўсю моц, маючы за плячыма не поле са стадолаю і хлявом, і не паўпісьменных бацькоў. Ад малога быў у Залатой Празе, у сапраўднай Еўропе, а мацеркаю яму — Ларыса, ужо тады паэтка Беларусі; бацька, Іван, як і сын потым, лекар ды чыстае пробы інтэлігент, у доме якога не мэбля бліщчучая цанілася, але тамы кніг. На жаль, у пару фашызмаў гэткія людзі гібелі ў лагерах, а іхныя дзеці гадаваліся круглымі сіротамі; так здарылася і з Юркам. У Беластоку апынуўся ён дзякуючы сваякам маці, якой род адвечна караніўся ў Крынскай воласці, што пасля вайны адыйшла да Польшчы.*

*Дэб'ютаваў Юрка Генюш у свае студэнцкія гады, канчаючы беластоцкую Медыцынскую акадэмію. Пачынаючы «белавежац» стартаваў на старонках «Нівы», вакол якое і віраваў тады наш піскплячы Парнас.*

*Памёр у 1985 годзе, у няясных па сёння акалічнасцях, на пяцідзесятым годзе жыцця.*

*У прапанаванай Шаноўнаму Чытачу кніжцы рэкамендую сціплы выбар яго паэтычнай прозы, у якой вельмі цэльна праявіўся талент Юркі Генюша.*

Сакрат Яновіч

## СПАЧАТКУ БЫЛО ТОЛЬКІ СЛОВА...

Бойцеся Слова! Прад ім трапячыце. У ім Ваша смерць, нягоднікі ды злыдні. І малаважныя сотні лет ці тыдні: біць яно будзе ў зачыненыя дзверы ... Усё ж пранікне.

Бойцеся Слова

Ратунку Вам не будзе, як няма спакою. Як сну няма; як роспач, прыхаваная гульбою, зморай душыць.

Бойцеся Слова!

І што з таго, што Вашыя прысуды, паводле Вашых жа правоў, у харомах Вашых, выносяць нам патомкі Юды, за вырванае Вамі ж народу серабро?

Бойцеся Слова!

О родзе Юдзін! Маліся, плач, уцякай, руку ліжы з адданасцю сабачай — цень твой усё роўна падзе асінаю, рук пераплёт ... пятлёю.

Бойцеся Слова!

Не закаваць у путы жаваранка ў небе. Спрабуйце перад строем мару расстраляць. Калі насустрач палымянай лавай льюцца словы; калі іх рэхам адгукаецца зямля, — лясы, палі, дубровы; калі ўласны салдат падставіць вуха ім гатовы — пазіцыяў, даруйце, танкам не стрымаць.

Бойцеся Слова!

Вось жменька слоў крылатых да сонца ўзнялася. Там хтосьці з клеткі ўзяў ды выпусціў другую. Не

трэба корму ім на тое, каб жылі: мужнеюць у прасторы, чакаючы вясны. Не птушаняты ўжо — дарослыя арлы — гатовы каменем несціся да зямлі. Вось збіліся ў хмару з гнёздаў усяго свету.

Пры гуле гэткай хмары тонкі піск ракетаў, паверце, вераб'ям на смех. Ды трапіць як — у звідлівасць, у дрыжыках, наспех?

Бойцеся Слова!

І сховішчаў няма, няма і абароны. Што супрацьставіць бязлітаснаму джалу, якога не бярэць і ні агонь, ні меч? Куды Вам уцячы? Няма такіх пустэч, куды не сягнула б; няма такое далі, не засланіцца нат сцяною з кутай сталі — бо словы, вядома ж, самыя гартуюць сталь і таму праз сталь, наўскрозь, патрапяць біць на смерць.

І таму надалей кажу Вам -

Бойцеся Слова!

**ЗАПАВЕТ**

І падаў снег. І белым вершам астры ўпісалі памяць жывых над прахам небыцця. І цені сэрцаў у вопратках мястовых купінамі, бы вербы, гнуцца пры грабах.

Падкошаныя пні. Галіны рук спляліся ў знак пашаны. І толькі вуснаў два апошнія лісткі малітваю дрыжаць у асеннім ветры.

Сканала сонца. Раптам. Нечакана. І дзень ужо вырваны з календара сам злёг у труну. І ноч-удава, бы павуціннем смерці, накрыла могільнік загібам цалуна.

У мроку тым, густым ад паху ўспамінаў, духмяным дымам узношанай мальбы, снуюцца душы добрых і паганых, і толькі на агарках свечак аганькі хістаюцца туды-сюды ў нямым паклоне.

І цішыня ў вушах гудзе трубою.

Здаецца, што вось-вось перад табою расступіцца зямля, і мерцвякі, хрустаючы касцямі, натоўпам выйдуць глянуць на жывых.

І наўкруга ўсё падзе ніц прад імі. Пад вопраткамі сэрцы ажывуць. І страх іх сшчыміць, сцісне кіпцюрамі, вырве з іх праўду, змусіць шчыра біць.

Бо суд ідзе!! — сатлеўшых, па-над тымі, што ў целе будучы, ўсё ж гніюць. Смертны патоўп, хрустаючы касцямі, як час няўмольны, уперад брыдзе. Успыхнулі рэшткі свечак аганькамі, каб шлях асветліць белай грамадзе.

І кулакі самыя ў грудзі б'юць. Мая віна. Мая віна прад вамі.

І вурдалакам дзесьці пёс завыў. Дзесь гукнула сава. У напоры ветру тапалёвы хор заенчыў прывітанне. Пярэдні, тут, парушыў сківіцай

бязмоўнай. Скрыгат зубоў гучыць нямым папрокам. Дном пекла пачарнелі яміны вачэй.

І кулакі самыя ў грудзі б'юць. Бо ёсць грахі, якіх не выбачаюць.

Мая віна. Мая віна прад вамі. Бо нас няма, а словы

мусяць жыць, мовы, якой мяне на гэты свет віталі. Той мовы, якою з светам развітацца найлягчэй. На добры лёс дзяцей. На тое, каб і мне ў свой час зямелька родная цяжарам не была. Натое, каб калісь сваім прылегчы з вамі.

**АФРЫКА**

Чаму я чорны, чаму я чорны, мамо - хоць белы маю твар? Чаму мне вецер заўсёды ў вочы дзьме?

Афрыка наўкола, Афрыка — перастук бубноў. Дарэмна хаваць галаву ў пясок — ахвярай не змякчыш багоў.

Тум-да-та, тум-да-та, тум-да-та-там. Хто чорны, той карак свой супроціў волі гне. Джунглі ж навокал, як у жудасным сне, енчаць, рагочуць, ляскаюць ікламі — дзяруць за жывое, каб быць пры катле, душаць за горла, захлынайся крывёю ...

О-о-о! Чаму я чорны, чаму я чорны, мамо – хоць белы маю твар?

Доўгае вуха ўсюды — і тут, і там. Новым адкуль не падзьме, кожны подых пачуе, і дакладна прасочыць, якім крокам хто крочыць. Усё ловіць, хапае, усё на нітку матае, павуціну наснавала ўкруг. Ці галосіць там-там, ці заенчыць душа, ці дзе слініцца ядам змяя ...

О-о-о! Чаму я чорны, чаму я чорны, мамо – хоць белы маю твар?

Ільвы і сланы, глянь, на волі — без крат. Насарог трыбушыскам прымінае траву, буйвал з балота ўзняў галаву, іржавай плямай мільгануў леапард, зебра пасецца побач з антылопай гну.

І нават арлу і таму неўздагад, што тут — рэзерват...

І толькі гіены гагочуць. І шакалы смяюцца.

О-о-о! — Мамо!

## УСПОМНІ

Здараецца пад восень — нанова зацвітае бэз. Чаму і скуль — вазьмі ды адгадай.

Як выбух радасці ў адчаі беспрасветным — мала таго, што маем лістапад.

Дзіцячым смехам буйна заіскрыўся, расой духмянаю асеў на ламаччы, званочкамі ўсё разбудзіў наўкола. Птушкам голас звярнуў, уваскрэсіў у сэрцах бой; ізноў на свеце май, і вірам пайшла кроў, у вачах бадзёры бліск, сцяліся кулакі і лёгкім здаўся шлях, дарога ў нікуды, — хочацца жыць.

Калі здаецца, што ўсяму канец. Ногі, хоць у ботах, ужо толькі босы пакідаюць след і кожны крок крывёю значаць. Неба імглою зайшло, вусны спёкаю гараць, карак, сагнуты дугой, восень потам зліла ды прываліла глыбай твой прахтораны след і дарогу ўпярод ўсю пяском замяла, і хочацца навек заплюшчыць вочы ... Успомні: бывае восьь, нанова бэз цвіце.

Калі падняць бярэмя, здаецца, не пад сілу. Не цела ўжо, але анучa. Запёрла ў лёгкіх дых, скруціла рукі, пад лыжачкай шчыміць. І ўсё ўжо прагніло, і усё заплеснела. Смяецца вораг, прыяцель прадаў, і багна наўкруга, і помачы знікуль, а толькі здзек ... Успомні: бывае восьь,нанова бэз цвіце.

І голаў падымі, і кроч далей, — каб жыць!

## НАС МІЛЬЁНЫ

Мільён — адзінка, шэсць нулёў. Чагось, вядома, горба. Насып хоць макавых зярнят, а поўнай будзе торба.

Сама ж адзінка без кружкоў, як кіёк жабрачы. Як крыж на ростані дарог. Як чалавек без сваякоў — адцяты хвост сабачы.

Ізноў нулёвыя кружкі — мярцвячымі вачыма, хоць ты іх рэшатам лічы, ці прыгаршчамі сып у мяшкі, будуць пусцей пустога. Колькі б тым ямам не чарнець — не ўбачыць ім жывога.

Нулямі засяліць зямлю — насыпаць ветру ў дзежку. Таму адзінкі ды нулі бываюць упераме шку.

Адна адзінка, шэсць нулёў, — мільён ужо стаў сцяною. Быццам бясконцы рад дубоў, поўнае неба жаўрукоў... Пралітая за волю кроў, як лівень мацярынскіх слёз.

З адзінак творыцца народ. Нулёвы карагод у шарэнгі ставяць, бы салдат. З кружкоў бястварых твораць лік. І кожны лік, як з братам брат, стае ў ланцуг сваячы.

Сама ж адзінка без нулёў, бы той кій жабрачы. Як крыж на ростані дарог. Як чалавек без сваякоў — адцяты хвост сабачы.

## ЯНЫЧАРЫ

Лязгаула лёза аб лёза. Жалеза жалезу насустрач. Цёплае крыві лізнула б — як хлопец дзявочых вуснаў.

Лізнуўшы, усмакталася б у цела, шукаючы ў сэрца сцяжыны. Згусткамі чырвані ірдзела б — бы хлопец у абдымках дзяўчыны.

Смерць янычару не грозна. Іскрыцца лёза аб лёза. Прэць ўпярод лава пяхоты. У адзін згібаецца лук. З-пад гострых шаломаў адно быццам пучыцца вока. Тысячай шабляў тнець меч Прарока. Упярод! Назад ні кроку! Ірвуцца з дзікай ахвотай — бы ў спотыкі палкіх пяшчотаў.

Сінявокія ды бялявыя. Мацярок хрысціянскіх сыны. Паўмесяцам узгадаваныя — у бок Каабы адбіваюць паклоны. Яны сцяною Ісламу. Яго плячом ды вокам. Гатовы ў хвалу Прарока душыць і сясцёр і братоў.

Адна ўзнагарода за гэта. Адна янычару ёсць мэта. У бітву ісці, як на свята. Прыняць смерць - з рукі кроўнага брата. І верышь, што блуднага сына ўтуліць па сконе айчына. Бо здраднікаў, нават за гэта, не бяруць у рай Магамета.

## ЧОРНЫМ ПА БЕЛАМУ

Здаецца, сёння белае ўсё. Па белым свеце белыя дарогі. Вось толькі заімшэлыя, бацькоўскія, парогі кінуць — і ўжо яно. Самога Бога ты, здаецца, за бараду схапіў.

Белы-белы настане дзень. Ніхто не ведацьме, хто ты такі. І толькі ў песні, у святочнай, пад чарку, — дзяўчына мыцьме ў рэчцы ручнікі.

І белы-белы матчыны твар растане ў малочным тумане. Назаўсёды амаль. Каб не ведаў сусед. Пакуль доля ліхая не змане.

Белых бярозак прывідны чарод, белых грыбоў ліхаманка пад восень ужо сніцца толькі, і, мо незнарок, прагна хаваеш прыгаршчы ў кошык.

Снежных юнацкіх мараў кужаль, не затоптаных, сонцам абмытых, — скрутак застаўся недзе на гарышчы, у хаціне бацькавай пад шчытом.

І бель, што вочы слепіць, дзявочых грудзей каханнем налітых, як расою сенакос, — вуснаў сухіх ужо ж не змочыць.

Здаецца, сёння белае ўсё. Па белым свеце белыя дарогі. Толькі крочыць.

Ды толькі словам бела-бела беларускім прагна чакаеш, каб адгукнуўся хто …

## СЕЙБІТ

Загончык невялічкі, які, здаецца, ворагі і насмешнікі далонямі накрыць змаглі б, ды і той камянямі-падкідышамі панатыканы. Ні то завораны — ні то грэбенем падзеяў расчэсаны.

А ён ідзе! Крочыць праз дваццатае стагоддзе, сыплючы ў крывыя барозны жменю за жменяй. Жменю за жменяю зярнятаў, часамі ад чужой прымешкі ледзь ачышчаных.

Быццам бы не бачыць суседніх тлустых дзялянак, на якіх, здаецца, і верабей арлом разгарнуўся б.

Быццам быне заўважаешматлікіх сеялак, гатовых ахвотна падмяніць ягоную даматканую плахту.

Сее і верыць! Верыць ва ўраджай.

Няўжо ж ён думае, што хто-кольвек палашчыцца на ягоны чорны, з мякінаю, хлеб?

Хто ж ён такі? Дзівак якісьці? Ідэаліст? Апошні зубр з Белавежскай пушчы? Адкуль узяўся гэты небарака?

А, можа, сейбіт гэта — ты, мой сябра па пяры, пісака?

*Пост скрыптум*:

Вось і наблытаў! Што за параўнанні? Ізноў я з фактамі не ў згодзе.

Ядуць жа чорны хлеб. Дый хваляць яго тыя, каму жывот успучыла ад булак.

А зубр — які ж ён апошні? Гэта ж калісьці. А сёння іх, рагатых, не проста ўжо злічыць. І з пушчы вылезлі ж, у свет шырокі пруцца. А дзе-якіх ў валюце нават цэняць.

Хоць — не, браткі! Тут падабенства яшчэ можна дашукацца. Бо ж ведама ўсім, што роднай барады ніводзін зубр пакуль што не згаліў па тое, каб пад вала прыстасавацца.

## ЖЫРАФА

Жырафа мажджачок свой вынясла над дрэвы. Куды там да яе ўсялякай драбнаце. Задзёршы нос пад хмары, сябе адну цэніць, а рэшту свету мае ў хвасце.

Паважна мордай тыцкаючы ў неба, шукае формул вечнага быцця — нястомна пеажоўваючы жвачку.

Не могучы ніяк сягнуць карэнняў, не гляне нат ўніз — грызець вяршкі. Дый тыя, пакуль да тонкае дойдуць кішкі, страцяць усю вартасць у сэнсе зместу. Мясі іх з слінаю і ноч і дзень — не выляпіць буханку з таго цеста.

Часамі, праўда, калі ілбом трэсне аб галіну, то, раскірачыўшыся, лезе да крыніц — папіць вады.

Схіляцца не прывыклая, сагнецца ў тры бяды і ўбачыўшы, што ўсё ж ёй не сягнуць ёй да стругі, паваліцца з пакорай на калені …

## ГІЕНА

Трыбух гіены набіты падлам. Аношні кус застраг у засліненай зяпе. Глынуць не праглыне, а выпусціць не хоча - яшчэ хто забярэ ...

Ужо сківіцы звяло, выпучыла вочы, дрыжма-дрыжыць і задыхаецца з віскліўым хрыпам. Крывая ад прыроды, спружыніць абручом — не месціцца ўжо апошні кус, а яна жэрці-жэрла б цяпер і надалей.

З застраглым у зубах крывавым ласкутом, з прышчымленым між ног падціснутым хвастом, з натугі лезе ракам, скідаючы ў сляды ашмоткі поўсці.

А небасхіл, што толькі серабрыў, жаўцее няўмольна. Вось-вось сонцам блісне...

І нават, калі б ноч трывала найдаўжэй, каліcь яе падменіць новы дзень... На выпертых рабрынах ляжа цень і вырысуюцца палоскі арыштанта.

## СОН

О, Божа мой, які ж агідны можа часамі сон прысніцца! Бачу: праз увесь горад разваліласе карова.

І ў дэлірыум такога падла не пабачыш.

У самы цэнтр рагаты лоб уперла, слінявай ляпай плошчу абхапіла. Язык шурпаты — валам мяса ўваліўся ў святыню ўсіх газет. Трыбух агромністы ўзвысіўся пад неба.

Вымя дойнае багнам расплылося па скрыжаваннях усіх, па вуліцах, па скверах.

І выхаду няма!

Куды бы ні зірнуў — ружовым частаколам наёжыўся штыхетнік росных цыцак. Хоць ты адразу ўласны цэбрык падстаўляй.

І ашалеў народ. Бяды не чуе, лезе па спажыву. З гаршчкамі, з вёдрамі, хтось ванну прывалок. А дзе-хто проста хлепча крывасмокам. Каму па барадзе цячэ, вочы шклянеюць ад перажору, — яшчэ хацелі бы.

Сапе пачвара — самой няёмка ёй, пэўна. Уся ўздрыганулася, ад сораму задумала хвастом прыкрыцца, ды як не дрысне... Увесь свет, здаецца, ўкола абасраўся.

## ЖНІВЕНЬ

Каласіўся жнівень золатам рублёвым. Той пажне, хто сеяў. Ці старым, ці новым, розніцы не будзе. Абы сеяў шчыра.

Разгарніся духам, сэрцам у зямлю ўрэжся, шчодра потам пакрапі, хрыбет трымай, як скрыпку, роўнаю струною. Хто карак сагнуў, хто згарбеў пад бядою, пад тым, як багна, гнецца баразна. Хто ні адной палоскі не назаве сваёю, той жаць не будзе.

Бо сярпом ці касою, а мо машынаю - тут розніцы няма. Бо і напраўду, калі сееш ты шчодраю рукою, куды б ні кінуў плённае зярня — яно ўзыйдзе.

І парасткі, як дзеці, пальцамі ў неба ткнуць у сваю зорку, каб зазіхацела тым святлом ядраным, што бацькі апяялі, што дзед успомніў перад сконам.

## ФІЛЬМ

Цікаўны фільм. Сюжэт жыццёвы. Героі, колеры, тэмп падзей - усё як мае быць.

Мільгаюць абразы. Не гледзячы натое, што кожны бачыць іх на іншай шырыні экрана - усе брава б'юць.

Глядач крычаць гатовы: „Вось так! Вось так яно! Вось гэтак трэба жыць!"

Фільм круціцца далей. Змяняюцца героі. Ды і гледачоў ужо другія пакаленні. Фільм захапляе іх, хоць ведаюць — не бачыць ім канца. Калі ж кране ён іх нарэшце за жывое? Пераканае, што замала брава біць.

www.kamunikat.org

## ДЗІЦЯЧЫЯ МАРЫ

Бела. Бела. Бела і пуста. Вялізная спакуса. Дзе ж мае фарбкі?

А ну, мазнем чырвонаю. Гу! Якая пляма расплылася. Што б гэта магло быць? Ні сонейка і ні агонь.А можа, вайна? Не! Вайна брыдкая. А яно прыгожае, быццам жывое і, здаецца, нават з ножкамі... Ага! Так, так. Так, пэўна, выглядае жыццё. Хі! Як смешна. Нічога не было, здаецца. А цяпер яно жывое і можа, на дзіва, варушыцца.

А што далей? Ага! Сінім пацягнем. Т-а-а-к! Тут палоску. І тут таксама. Хопіць ці мала будзе? А што сіняе? Кве-та-чкі і неба, і... і... шчасце. А шчасця ўсім заўсёды не хапае. Дык не пашкадуем. І тут яшчэ ляпнем. І там. І там. Э! Разальем яго стружкаю. Усім тады будзе.

О! А цяпер намалюем смех. А смех які? Хі! Пэўна, жоўты. Такі вясёлы, залаты, як куранятка. І мы, вось, гэты куток... Ха, ха, ха!! І той яшчэ. Хі, хі, хі!! І цэлую сярэдзіну. Усё, усё будзе смяяцца.

А што зялёным? Зялёным — лісцікі. А ў лісціках ... у лісціках птушачкі. А птушачкі — гэта-гэта-гэта песенькі. А песенек шмат. І мы іх — плямкамі. І плямка тут. Плім! Плім! Плім! І плямка там. Плям! Плям! Плям!

Мама! Глянь, які прыгожы, шчаслівы, вясёлы, расспяваны свет.

„А каб цябе, пастрэл ты сякі ды гэтакі. Чакай, прыдзе бацька! Дасць ён табе шчасце ды вяселле. Не так заспяваеш. Бачыў хто?! Усю сурвэту фарбамі замазаць."

## ЧАЛМА АМАР ХАЙЯМА

*Налей того вина, что если капнет в Нил,*
*То пьяным целый век пробудет крокодил.*
*А если выпьет лань, то станет грозным львом.*
*Тем львом, что а пантер и тигров устрашил.*
*Омар Хайям*

Вітай, мой дружа! Што з Табою? Чыркнуў бы да мяне пару слоў. Чалма Амар Хайяма ільнянай беллю рассыпалася ў сцежку, сцелецца дзесь ў далеч і, быццам гурт бярозаў, у адзін гай нас вяжа.

Ты не звяртай увагі, што часам хтось брудная лапай на яе наступіць.

Не табе ўпэцкаць гэткай чыстай белі, вражэ! У дажджы намокне, у сонцы праяснее. То прывіднай пятлёю перад злыднем ляжа, то светлай марай выбліснe ў прасторы. З віхуры сібірскай надзеяй бяжыцьме — родную хату атуліць імглою. То ручніком паслужыць хлопцам на чужыне — няма вады з Нёману, выбяляць слязою.

Сядзіць стары Хайям, ківаючыся, з непакрытай галавою. Вякі ўжо трывае жудны Рамадан. Што ў сонцы — сохне. Ад посту гарбее. А цемра жрэць, гуляючы дурэе ды па куску ўсё болей забірае дня ў сваё горла. Ноч усёдаўжэй ...

О, мой Сакі! Ты ведаеш законы. Алах адзін! І палец Прарока, як меч узняты над усёй зямлёю. І волас з барады не ўпадзе нам з табою без яго волі. Дык плюнь на Шарыят — віном напоўні збан. І вер і ты і ўсе, хто белай звязаны чалмою, што сваю чару споўніць трэ да дна — нават, калі б налітая была крывёю. Да дна — за светлы новы дзень.

## СМЫКОМ ПА СЭРЦЫ

*Выпускнікам бельскага ліцэя*

Навошта ў чалавеку струны існуюць? Закрані абы-якую - гул ідзе. Вясёлую — і рогат півам пеніцца. А калі сумную — кіпцюры па сэрцы заскрабуць.

Бо дзе той Бельск? Ёсць іншыя ліцэі, славутыя, ў гісторыю ўбітымі цвікамі. А я да вас імкнуся, хлопцы і дзяўчаты. На вашай ноце думкі мне пяюць — спеўку матчыную.

Бо не ўдалося піць мне з тых крыніц, дзе кожны дзень купаллем іскрыцца, дзе летні вечар коласам шуміць, дзе ловіш прагна кожны гук, каб не забыцца — хто ты.

І злосць бярэ, і ціснеш у руках паперу, і шчыміць нешта болем пад грудзьмі, і марыш — вось, каб двойку хто паставіў за мову родную, сярод сваіх, у сям'і.

А вас ужо грамада. Шарэнгі ў свет пайшлі, каб долю зваяваць. Сярод бландзінаў, рыжых і чарнявых ніводнага, здаецца, не пазнаць.

І струна брэнкнула. І вось зазыў сваячы вас склікаў у той скромны родны кут.

І цяжка мне. Хацелася б быць з вамі. З штодзённай муці плёснуцца ў стругу той плыні беларускай.

Гаворкай роднаю заліць тугу.

## ПАЧАКАЙ ЯШЧЭ -ДАЧАКАЕШСЯ

*Наташы*

Ты прысела на ганачку ціхенька-ціхенька. Маўчыш. Вочкі ж тым часам вавёрачкамі шмыг-шмыг, туды-сюды бегаюць, палымяным пералівам бліскаюць, кожную новую падзею адразу схапіць гатовыя.

Ды і вушкі крыламі растапырыліся — кожны подых новага, кожнае тхненне свету шырокага так, як матылькоў каляровых, ловяць.

Ты ж ужо, ой, якая дарослая — не зразумець гэтага татку з мамкаю.

Ты ж ужо, ой, колькі ведаеш — выявіць няма каму, падзяліцца з кім.

Вось, калі б на кані, на буйным на чатырохколым, тармазамі скрыгітнуўшы каралевіч пад'ехаў. Страсянуў бы валасоў доўгіх грываю, звязкай ключыкаў па далоні бразнуў бы ... Светлы ўвесь, у бляску сонечным, джынсы тут ды там папраціраныя. Сесці побач з ім так і хочацца.

А ў вушах гудзе ды па сэрцы б'е, наўкруга ўскалыхае ўсім той адзіны рытм — песня дзікая. І няўзгоды дня, сум штодзённых хвіль, уся нудота быцця — растварыліся. І не той ён ужо свет, шэры колер знік, расцвіло ўсё наўкола вясёлкаю.

Да цябе ён ступіў. Узяў пад локаць, вядзе, а па сэрца б'е рытм, вецер ногі абвіў, дзяцел дзесь на сасне лупіць дзюбай ў бубён, думкі ведзьмамі асядлалі цымбалы.

І не гром-то грыміць, а ўсё той жа рытм ашалела ў скронях стукоча. І хоць у пятках душа, кроў кіпеннем пайшла, варам шчокі зліла дзявочыя.

І ў руцэ ўжо рука, адным крокам ідзе след, у адно вока зліліся чатыры — перад імі адно, перад імі сваё - гэта тыя пабачаць, хто верыць.

Месца пры месцы, пры мне ты, а я з табою. Жахі ды ахі нам ужо неўспалох.

І конь заіржаў, на ўсіх, на чатырох цыліндрах. На рыцарскім шчыце заірдзелі аганькі.

Трымай мяне, трымай мяне, мой любы! Палёт арліны запірае дух. Нават тады, аднак, калі б у свеце мы былі адзінымі — паімкнемся па вясёлцы, па лузе, пупе цяжарнае краіны - пагоняю.

## З УЧАРАШНЯГА Ў СЁННЯ

*(урыўкі)*

Склікаю Вас у гасціну, буйныя браты.
Раскінем ільняным полем гісторыі абрусы.
Будзь нам сталом дубовым хоць века ад труны,
Калі гуртам засядзем — усіх вякоў сыны ...

* * *

Стук-перастук капыт малаткамі ў скронях б'ець. Рассядлай ужо Сіўка, дай каню адпачыць - змілуйся, Ярыла!

Твар свой сонечны скрый, у апачывальню зыдзі, зрэнкам аслепнуць не дай — змілуйся, Ярыла!

Свят! Свят! Свят!

Вольным ветрам дыхні, Стрыбожа. Яшчэ раз! Яшчэ раз! Валасы патрывож. Сэрцы ў нас скалыхні. Вей! Вей! Вей! Вольным ветрам дыхні, Стрыбожа.

Мрок навесь цалуном, каб не згледзеў ніхто. Каб ніхто не ўрок — ні наш. край, ні алтар, ні ахвяру, якую даём.

Стары шалом на спарахнелым пні. Галубка з ранай пад грудзьмі. З той раны стружкаю крыві — у чарпак крынічнае вады — жыццё сплывае́ць цёплай хваляй. Яшчэ дакінуць дзівасілу, зуброўкі, сумніку, зарніцы. Касцей сатлеўшых сыпнуць жменю. Зямлі, што з дзедаўскай магілы. Дадаць да смаку горкіх слёз... І чару падымаю да нябёс. Далоні ірдзяцца, бы ў агні. Не грэбуй — выслухай мальбы! Удар, Пяруне!

* * *

Зацвіла калінай родная зямля.
Белай, белай, белай — сувой палатна.
Каб пад восень, нечакана,

www.kamunikat.org

Даспяваць крывавай ранай.
Звісаць чырванню караляў.
Згусткамі сплываць з галля.

* * *

Ад захаду грымнула бураю. Да чарноты
ссінела неба.
Жыццяў нашых, крыві ды цела, ненаеднай
пачвары трэба.
Не было пражэрлівей жорала, хоць не адна
нас зжырала зяпа.
Вечар бадануў у лоб раніцы. Раніца ўперлася
ў вечар
І мрок настаў. Мрок спрыяльны кату ...

* * *
Танцавалі хлопцы на шнурах — крыжачок,
а, мо, польку.
Заплывалі ім вочы ад гару — а мо не толькі.
Клаліся целы ў адзін, у дзве, у тры столкі.
Буйнелі нівы замест жыта — асотам.
Каб вораг яму ў гэтай жа зямлі заскварыў,
Якую смеў таптаць акутым ботам.

* * *

Зубамі браліся за шпалы.
Уся зямля была дрыгвою.
Каб змог прайсці хто за табою,
То клалі сцежку сам-сабою.
І на твае ступіўшы плечы
Іграўся наперад другі й трэці.
На яго карку ўжо дзесяты,
Ставіўшы ногу, цвёрда верыў,
Што хоць крывёю брацьмуць рэкордныя надоі,
Той цэбар смерці ўспеніцца надзеяй ...
Ды толькі так змянялі бег падзеяў.

* * *
ЗабялІла раніца туманом рэчкі-рэчанькі.
Разлівае боршч пунсовы берагам-братам.
Гаспадарскі — як у звычаі.
Навар тлусты — на ўсім краі.
Пі з карыта, сёрбай смела, — усё навокал
патаннела.
Кожны дорыць, чым багаты, — не пытай цаны.
Каму, можа, мала солі, — зачарпні сіроцкай
долі.
Каму перцу — хопіць хатаў сцёртых на вуглі.
Пі з карыта, сёрбай смела, усё навокал патаннела —
разам і з людзьмі.

Маеш вусы ў іржы. Спаласні трысьнягі —
Шэпча праваму бераг ліхі.
Правы бераг ліхому адгукае ў адказ:
Спаласні трысьнягі, бо іржа на вусах.
Хваля хвалю жанець ў мора,
Бераг з берагам гамоняць.
Жыравацьмем, покуль дораць.
Нахлепчамся да ўпаду.
Хвалі зловім — да апошняй!
Усё працэдзім праз трысцё.
Няхай поіцца ракіта.
Няхай жлуктацьмуць палі.
Падсілкуем усю прастору.
Не прапусцім кроплі ў мора — роднае крыві.
Там растворыцца, загіне,

Бы лісточак, што з галіны
Змяло віхрам бурнай ноччу,
Скамячыла ды паперла — дзесь за небасхіл.

Там растворыцца, загіне.
Прыме колер чужой плыні.
Бескарысна дзесь буцьвецьме.
І галлё, што сыпле квеццем — будзе толькі сніць.
Хай сілкуецца прастора.
Не прапусцім кроплі ў мора — роднае крыві.

Хваля хвалю жанець ў мора.
Дзень за днём нам сонца дорыць.
П'ець ракіта, мо з пахмелля, — чуючы вясну.
Абцякаюць ціханька, быццам бы слязьмі,
З галадухі спухлыя белыя палі.
Звыш сілы цяжар плечы асядлаў.
Ад натугі ўспацелі сцежанькі людзьмі.
Кропелькі поту стружачкамі збягаюць.
Сыплюцца патокам у кацёл вайны.
Восень абцярэбіла лісцейка з галля.
Прайшла дрывасекам жорсткая зіма.
У журбоце дрэвы ручанькі ўзвялі.
Родзічы, што плачуць па блізкіх ад радні.

* * *

А край жывець вось, са сну
Амаль смертнага ўсё ж праціраe вочы.
І будзе, як адвечна…
На кволых грудзях узгоркаў новая
зазелянее рунь.
Безліччу галоў непрычэсаных устрасяне
памаладзелы лес.
Ды з часам песню пачуеш і смех іскрысты —
дзявочы.
Бо хлопцы … бо хлопцы яшчэ на вайне.

Дзярэць за горла смага.
Цесна тугім грудзям.
Нейк пуста, томна, млеўка, пад лыжачкай
шчыміць.
Балючым крыкам ірвецца просценькая
спеўка,
Можа, дзе пачуюць нашы дзецюкі?

На гэты кліч птушыны, спякотны ўспамін
Вяртацьмуцца хлопцы й сталыя мужчыны
З межаў таго свету — на шасцёх адзін.
Дзе тых пяцерых — хто ж так адгадае?
Туліць дзесь да сэрца іх зямля чужая.
Туліць з абавязку, як не свая маці.
Няўтульна, нябогім, у той пасцельцы спаці.
На шасцёх аднаго вітаюць дзяўчаты.
Болын буслоў на стрэхах, чым мужчын па
хатах.
У плуг упрагліся маці ды з дачкою.
Адну тугу тужаць — адной баразною.
У мяшку не ўтрымаеш рою пчол бясконца.
Дзеўкі да кахання, кветкі імкнуць да сонца.
Зачарпнуці шчасця не кожнай прыпадзе.
Не хопіць падпоркаў, колькі дрэў у садзе.
Гарэла лета, ліпень бзыкаў млява.
Пайшло ўжо колішняе семя ў каласы.
Хадзілі зноў у госці, не машыравалі,
Свае хлопцы — замест былых салдатаў.
Праснілі жудны сон ды цешацца надзеяй.
І вусны вуснам шэпчуць тое, што заўсёды.

І рукі блудзяць, дзе ніхто не быў, а ўсё вядома.
То цвітуць, то адцвітаюць прыполы дзяўчат.
Уздымаюцца, бы цеста на росчыне свежай.
Бусліны клёкат чуецца ля хат
Ды быць нам з ураджаем — ажывае племя.

## КРУПНІКУ ПА ЧАРЦЫ ВЫП'ЕМ, ЛЮБЫ ДРУЖА

Варыла маці крупнік, ціха чаравала.
Мёд спадзёвы, цёмны капаў, бы з грамніцы.
З вядра, быццам вока, поўнага да краю
Лінула, да меры, празрыстай слязою.
Сыпала карэнняў, мяшэчкаў не злічыш,
Цудатворных зёлкаў — сваёй таямніцы.
Дроў кідала ў печку заўжды скупавата,
Каб душу сагрэці, не згарэла б хата.
Усю чужую накіп, што наверх усплывала,
Сярэбранай лыжкай з пенаю збірала.
Быццам далікатна, а ўсё ж сурова.
Гонар гаспадыні вымагаў такога.
Чысты янтар шкліўся, вабіў глыбінёю.
Пах духмяны п'яніў, змушаў быць сабою.
Пасля ўжо рашуча, цвёрдаю рукою
Далівала моцы, сілы ды настрою.
Такой медавухі кубак ламатнуўшы,
Мёртвыя ўскрасалі, будзілі заснуўшых.
Чым мне напаіці, дружа, нас з табою?
Таямніца зелля ж адышла ўраз з ёю.
Ды не ўдаецца жорсткай пяцярнёю
Змяшаць моц, у меру, з крынічнай вадою.
Няхай тады будзе, быццам на кургане,
Таго памінацьмуць, хто ўжо не ўстане.
Належную зброю побач з ім злажылі.
Скрутачак паперы, два гусіных крылы.
Ёсць і верацёнца, жмут белай кудзелі.
Хай снуецца нітка бясконцай надзеяй.
Памянем, як мужна, без шчыта, суліцы,
Горда ўздымаў голаў супроць навальніцаў.
Мячом ваяваўшых кідаў на калені.
Палоніў на векі з кветкамі ў жмені.

Паклонімся нізка Светламу Ярыле,
Каб з промнямі сонца нам саслаў той сілы.
Воям не навіна ўсякія нягоды.
Пярун размахнецца молатам па небе.
Стрыбог дзьмухне гарам паленых сялібаў.
Гэй вы, варажыхі, не шкадуйце чараў!
Вуглі шчэ ірдзяцца ў свежым папялішчы.
Свой агонь сагрэе, толькі чужы нішчыць.
Няхай пырскае, няхай булькае.
Кацёл яду на іскрах дня.
Размясеце ж варыва, ведзьмы!
Няхай пеніцца, хваляй плешчацца.
У клубах пары, як у цалуне.
Праз усе шчыліны і душы сочыцца.
Каб, хто вып'е - спіны не сагне.
Першы кубак у зямлю ды на ветры чатыры
Пырснем шчодра ў ахвяру багом ...
Пасля вып'ем самі ды другі раз паўторым,
Бо хоць шмат курганоў - мы далей жывём.

**ДА СВЕТУ**

За вокнамі цёмна-цёмна, вецер дзьме.
Белай плямай вабіць-вабіць
Картка на стале.

Аб шкло лямпы п'яны-п'яны б'ецца авадзень.
Алавік сам лезе ў руку
Ціха, як зладзей.

Воўкам шэрым вые-вые ў душы туга.
Мо, ты пятым, непатрэбным,
Колам для ваза?

Мару-птушку ты ловіш-ловіш на страсе.
Можа, лепшай луста хлеба, —
Верабей у руцэ?

Аднак думкі гоняць-гоняць да стала.
Абмінаюць слоў шарэнгі,
Рэшткі авадня.

Пасля ночы будзе-будзе колісь дзень.
Мы не можам жыць без свету -
Я і авадзень.

www.kamunikat.org

**ЗМЕСТ**

*СЭРЦА*
Яна лічыла сябе яцьвяжкай
«Мужыкамі нас клічуць і хамамі.»
«Зашчымела мне сэрца ў грудзёх.»
«Памутнелыя вочы ў тузе...»
Беларуска
Усё роўна мне
Зь мінулага
Выйшлі сяньня
Чужыне
Прачнулася ў няволі цемнаты
Над народам ўсё чужыя босы
«Ужо вятры мяне наскрозь прадзьмулі.»
Арлы толькі прагнуць лёту
Жыровіцы
«Моладзь ідзе няпэўна.»
Шлях
«Бацькаўшчына, зямля дарагая.»
«На працягу шматлікіх вякоў.»
«Дзіўны час, і збываюцца мары.»
Даражэнькія, блізкія, родныя
«Шукаючы звонкай бунтарнай паэзіі.»
«Сто ямін на пакутны шлях.»
«Ня плачце над маім крылом.»
«Змыты дажджамі дзявочы мой сьлед.»
«Лёс мой пакутны і век мой даўгі.»
«Нэрвовы плач, нэрвовы сьмех.»
«Ты - пан зямлі, я - пан свайго сумленьня.»
«На мозг кітайцы капалі вадою.»
«Жыцьцё бяз болю не прайсьці.»
«Не хачу быць дома эмігрантам.»
«Ужо даўно адабраў тамагаўкі.»
«...ўрываемся ў чужы спакой.»
«Далі табе нямала чарак.»
«Калі лёс мяне злы прыгнятае.»
«Гаварыць па-беларуску гэта модна.»
«Трывога. Стукоча сэрца.»
«Ты не пішы мне болей, дарагая.»
«Не жыцьцём напоўнены дзень да краёў.»
Моладзі
Наш сьцяг

*ДА СВЕТУ*
ПРАДМОВА
Спачатку было толькі Слова
Запавет
Афрыка
Успомні
Нас мільёны
Янычары
Чорным па беламу
Сейбіт
Жырафа
Гіена
Сон
Жнівень
Фільм
Дзіцячыя мары
Чалма Амар Хайяма
Смыком па сэрцы
Пачакай яшчэ - дачакаешся
З учарашняга ў сёння
Крупніку па чарцы
Да свету

© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год
www.kamunikat.org